# Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР

# К. В. КІСЯЛЁВА

## на пленарным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН 10 студзеня 1957 года

Пан старшыня,

Панове дэлегаты,

Па намаганню дэлегацыі ЗША і некаторых іншых дэлегацый Генеральная Асамблея зноў вярнулася да абмеркавання так званага «венгерскага пытання». Натуральна, у простага чалавека ўзнікае пытанне, чаму Генеральная Асамблея так многа часу ўдзяляе венгерскаму пытанню і да гэтага часу не распачала абмеркавання такіх важных і актуальных пытанняў, як раззбраенне, алжырскае, кіпрскае, пытанне аб Заходнім Ірыяне і іншыя. Гэта адбываецца таму, што амерыканская дэлегацыя прабуе выкарыстаць так званае «венгерскае пытанне» для разгортвання самай раз'юшанай антысавецкай і антывенгерскай кампаніі з мэтай дыскрэдытацыі Савецкага Саюза і народна-дэмакратычнай Венгрыі.

Цяпер, пасля ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу ў Венгрыі, асабліва выразна відаць, якія далёка ідучыя і чорныя планы выношвалі міжнародныя рэакцыйныя колы ў адносінах да краін сацыялістычнага лагера на чале з Савецкім Саюзам.

Імкнучыся захаваць тэмпы гонкі ўзбраенняў, як крыніцу сваіх казачных прыбыткаў, яны сталі на шлях правакацый, на шлях зрыву змякчэння міжнароднай напружанасці, яны адкрыта выступілі супраць палітыкі мірнага суіснавання дзяржаў з рознымі грамадска-палітычнымі сістэмамі.

І ў той час, калі харцісцкія банды пазверску расправуляліся з венгерскімі рабочымі, сялянамі, інтэлігенцыяй, калі лютаваў белы тэрор у Венгрыі, у гэты час у ціншыні кабінетаў манаполій і канцэрнаў ЗША, ФРГ, Англіі і Францыі ішоў торг аб падзеле прыродных багаццяў Венгрыі: волава, медзі, цынка, алюмінія і іншых выкапняў.

Цяпер ёсць ужо шмат фактаў, якія сведчаць аб падбухторшчыцкай, правакацыйнай ролі буйнейшых манаполій ЗША ў правалі ўшымся фашысцкім путчы ў Венгерскай Народнай Рэспубліцы. Кіраўнікі буйных манаполій стварылі рэакцыйную арганізацыю пад назвай «крыжовы паход за свабоду», штаб якой знаходзіцца ў Н'ю-Йорку на рагу Іст-Рывер Драйв і 46 вуліцы, якая была актыўным арганізатарам фашысцкага путча ў Венгрыі. Кіраўнікі гэтай арганізацыі мелі ў старой харцісцкай Венгрыі фабрыкі, заводы, нафтапромыслы і г. д. Яшчэ ў 1933 годзе ракфелераўская «Стандард ойл оф Н'ю-Джэрсі» атрымала ад Хорці ў Венгрыі нафтавую канцэсію на плошчы ў 3 мільёны гектараў. Таму не выпадкова, што старшынёй совета «крыжовага паходу за свабоду» з'яўляецца Юджын Халмэн — ён-жа старшыня праўлення буйнейшай ракфелераўскай нафтавай кампаніі «Стандард ойл оф Н'ю-Джэрсі». Вось сапраўдныя натхніцелі і арганізатары фашысцкага путча ў Венгрыі.

У цяперашні час устаноўлена, што раз-

Адказваючы на пытанне, ці павінны ЗША «дапамагчы таму, каб баі працягваліся», Донавен сказаў: «Так, вядома, мы павінны». Ён заявіў далей, што, на яго думку, ЗША не зрабілі дастаткова для «венграў», і дадаў: «Я маю на ўвазе ў ваеннай галіне. Мы павінны даць узбраенне тым, хто ўсё яшчэ змагаецца». Згодна з заявай Донавена, для ЗША «яшчэ не занадта позна нават цяпер» дапамагчы і працягваць баі ў Венгрыі і «мы можам удасканальваць нашы метады». Гэтыя выказванні не патрабуюць каментарыяў. Ясна, што генерал Донавен выконваў заданні кіраўніка цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення ЗША Алена Далеса.

Яшчэ задоўга да венгерскіх падзей у заходніх краінах і ў прыватнасці ў Заходняй Германіі было пачата абучэнне ўзброеных груп контррэвалюцыянераў для перакідкі іх у «патрэбны» момант у Венгрыю. Як пісала газета «Брэменер пэйтунг» ад 9 снежня 1956 года, пад кіраўніцтвам так званага «бюро па справах венгерскіх бежанцаў», яшчэ некалькі год назад у Мюнхене, Штутгарце, Кронбергу і іншых гарадах былі арганізаваны спецыяльныя школы і курсы па падрыхтоўцы агентаў. Падзеі апошняга часу пераканаўча паказалі, што ў Заходняй Германіі створана шырокая сетка розных арганізацый і школ, занятых падрыхтоўкай фашысцкіх пагромшчыкаў, шпіёнаў і дыверсантаў для падрыўной работы ў краінах народнай дэмакратыі. Кадры для гэтых арганізацый

ў Аўстрыю, якая заключаецца ў спробе зноў актывізаваць тыя сілы, што выклікалі контррэвалюцыйны мяцеж у Венгрыі, падрыхтаваць новую змову, узмацніць міжнародную напружанасць. Наша дэлегацыя разглядае візіт віцэ-прэзідэнта ЗША Ніксана ў Вену як акт грубага ўмяшання ў справы іншых краін.

Пан старшыня, як вядома, пасля падаўлення контррэвалюцыйнага мяцяжу з Венгрыі ўцяклі асобы, якія прымалі актыўны ўдзел ва ўзброеным выступленні супраць народнай улады, крымінальныя злачынцы, былыя харцісцкія афіцэры і жандары, здраднікі сваёй радзімы. Пад уплывам варожай замежнай прапаганды Венгрыю таксама пакінула шмат ашуканых сумленных венграў, у тым ліку дзеці і падлеткі, якім яшчэ не мінула 18 год і якія маглі спакусіцца пошукамі прыгод. Цяпер многія з гэтых уведзеных у зман людзей жадаюць вярнуцца да сваіх сем'яў у Венгрыю, але іх не пускаюць, ставяць розныя перашкоды. Некаторыя прамоўцы многа гаварылі тут аб правах чалавека, аб роўнасці людзей. Чаму-ж тады да венгерскіх бежанцаў, якія жадаюць вярнуцца на радзіму, не прымяняюць права чалавека, чаму іх трымаюць у бараках, акружаных калючым дротам? Чаму венгерскіх бежанцаў гвалтоўна накіроўваюць за акіян у далёкія краіны? У цяперашні час вялікая колькасць венгерскіх бежанцаў, даведаўшыся аб указе Прэзідыума Венгерскага Народнага сходу аб амністыі ўсім

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы